"Танцы, якія раней практыкаваліся ў беларускіх вёсках, гарадах і мястэчках, былі чыстыя і цнатлівыя, — перадае словы кандыдата багаслоўя іерэя Яўгенія Саўчука mgazeta.by. — *Таму гэты баль можна разглядаць як спробу адрадзіць традыцыі танцавальнай культуры нашай краіны, як альтэрнатыву сучасным дыскатэкам".*

Марыя МАЛЕВІЧ.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

Чаму мужчыны скардзяцца на праблемы ў ложку?

Мінздраў дасць справаздачу за 20 гадоў працы. У Мінску адбудзецца агляд найноўшых дасягненняў у галіне медыцыны. З 26 па 29 сакавіка пройдзе 20-ы юбілейны беларускі медыцынскі форум "Ахова здароўя Беларусі-2013".

Сёлетнія міжнародныя спецыялізаваныя выставы "Ахова здароўя Беларусі", "ФармЭкспа" і "Стаматалогія Беларусі" пройдуць ужо ў 20-ы раз. Плануецца, што на выставе прадэманструюць сваю прадукцыю і тэхналогіі больш за 360 прадпрыемстваў і арганізацый з 15 краін. Прычым дэманстравацца будуць дасягненні ў самых розных галінах медыцыны — ад касметалогіі да хірургіі.

Падчас выставы збіраюцца абмяркоўваць і тыя пытанні, што звычайна ўслых не прамаўляюць.

Напрыклад, 28 сакавіка ў рамках Міжнароднай спецыялізаванай выставы "Ахова здароўя Беларусі" адбудзецца канферэнцыя, прысвечаная праблемам мужчынскай патэнцыі. Спецыялісты збіраюцца абмеркаваць, чаму ж усё больш мужчын скардзяцца на праблемы ў ложку і заклікаюць журналістаў і грамадскасць далучыцца да дыскусіі.

Сяргей ШЭЛЕСТ.

КРЫМІНАЛ

Зніклі грошы на рэканструкцыю культурных аб'ектаў Беларусі

Генпракуратура распачала новую крымінальную справу па "культурных будаўніках".

Спачатку пад крымінальны пераслед трапіў дырэктар "Аб'яднанай дырэкцыі аб'ектаў, што будуюцца" Мінкультуры **Аляксандр Трыфанаў**. Яму інкрымінавалася злоўжыванне ўладай і службовымі паўнамоцтвамі пры будаўніцтве аднаго з аб'ектаў, страты склалі каля мільёна долараў.

Цяпер Следчы камітэт разбіраецца з дзейнасцю былога дырэктара арганізацыі **Мікалая Юркевіча**. Між іншым, падазроны тры гады таму адзінаасобна прыняў рашэнне аб прадастаўленне пазыкі камерцыйнай арганізацыі. Пасля атрымання больш як 42 тысяч долараў апошняя пачала працэдуру банкроцтва і ліквідацыі. А грошы, якія мусілі пайсці на рэканструкцыю культурных аб'ектаў нашай краіны, зніклі, адзначае электронная газета "Ежедневник".

Таксама былі выяўлены парушэнні і пры рэканструкцыі будынка Вялікага тэатра оперы і балета.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
19 САКАВІКА 2013 г.

ПУЛЬС ПЛАНЕТЫ

Китай вошел в пятерку крупнейших экспортеров оружия

Об этом говорится в докладе, представленном 18 марта Стокгольмским институтом исследования проблем мира (SIPRI).

В период с 2008-го по 2012 год, по данным SIPRI, на долю Китая пришлось пять процентов сделок по обычным вооружениям. В 2003—2007 годах Китай обеспечивал лишь два процента мирового экспорта оружия.

Первое место в пятерке крупнейших экспортеров оружия занимают США (30 процентов сделок), за ними следует Россия (26 процентов). В пятерку крупнейших экспортеров оружия также вошли Германия и Франция, на долю которых приходится 7 и 6 процентов сделок соответственно.

Китай вытеснил с пятого места в списке крупнейших экспортеров оружия Великобританию. Изменения в пятерке лидеров рынка поставки обычных вооружений, отмечает SIPRI, произошли впервые с момента окончания холодной войны.

На вертолете из... тюрьмы

В канадской провинции Квебек двое заключенных вскарабкались по выброшенным из вертолета тросам и сбежали из тюрьмы Сен-Жером, в 60 км к северо-западу от Монреаля. Одного из них поймали, второго ищут.

Дерзкий побег в стиле голливудских боевиков был совершен в воскресенье в 14.20 по местному времени в момент дневной прогулки. По словам сержанта полиции **Бенуа Ричарда,** вертолет завис над землей с двумя тросами, по которым двое заключенных быстро вскарабкались в вертолет и улетели.

А вот в Кировоградской области Украины пресечена попытка побега двух заключенных из колонии на вертолете.

Как сообщается на сайте Государственной пенитенциарной службы страны, в субботу, 16 марта, на территории Петровской исправительной колонии приземлился вертолет.

Сотрудники исправительного учреждения сумели заблокировать его вылет и задержать беглецов и их пособников.

Рейтинг самых угоняемых авто

Японские автомобили марок Mazda, Mitsubishi, Toyota и Honda в 2012 году оказались в лидерах рейтинга самых угоняемых автомобилей, составленном порталом “Прайм Страхование”. В компании с “японцами” также оказались Ford и Lada, а машины люксового бренда BMW, напротив, выбыли у многих страховщиков из топ-5 по угонам в Москве, но все еще интересны угонщикам в регионах.

У СОСЕДЕЙ

Даля ГРИБАУСКАЙТЕ:

У нас достаточно причин вступить в еврозону как можно скорее

После нескольких лет политики жесткой экономии Литва выходит из кризиса и собирается вступать в еврозону. Благодаря чему? На этот и другие вопросы в интервью DW ответила президент страны Даля Грибаускайте.



— Литва почти десять лет в Евросоюзе. На очереди — вступление в еврозону. Кризис не изменил ваши планы?

— Экономический кризис — это не только кризис в еврозоне. Страны, в которых нет единой европейской валюты, тоже борются с экономическими проблемами. И наоборот, некоторые страны еврозоны вовсе не испытывают трудностей. Дело вот в чем: все новые члены Евросоюза, вступая в ЕС, подписывались под тем, что как можно скорее введут у себя евро. С этой точки зрения наш переход на единую валюту — это выполнение нашего обязательства.

Но особенность Литвы состоит в том, что у нас де-факто уже действует евро: наша валюта напрямую привязана к евро жестким обменным курсом, а наша денежная политика находится в очень сильной зависимости от Европейского центробанка (ЕЦБ). Собственных инструментов валютной политики у нас нет. Те обязательства и ограничения, которые действуют в еврозоне, распространяются и на нас, однако преимуществ от использования евро мы пока не имеем. Так что у нас достаточно причин, чтобы вступить в еврозону как можно скорее.

— Но кризис продолжается. Одни страны должны делать все новые и новые финансовые вливания в пользу других. Вы не боитесь, что может наступить коллапс системы?

— Тут дело не в евро, а в экономике и финансовой политике и в ответственности отдельных участников данной системы, а эта ответственность не всегда имелась. Если не удалось принять ответственные политические решения в собственной стране, то не следует винить в этом евро.

— В 2009 году, когда по Литве сильно ударил кризис, вы ввели жесткие меры экономии. Тогда вы не стали обращаться за помощью к МВФ и даже заявили: “Слабы те страны, которые не могут помочь себе сами”. Почему вы выбрали такой путь?

— Я полагаю, Литва хорошо справилась сама, без диктата извне. Это то, что я имела в виду: когда имеются политическая воля и ответственность, помощь не требуется. Дело в том, как управлять страной. Именно недостаток этой ответственности — проблема южноевропейских государств.

— Ваша соседка Латвия пошла другим путем и за помощью обратилась. И сегодня ее экономика — одна из наиболее быстрорастущих в Европе. У вас это не порождает сомнений в верности собственного решения?

— Как экономист скажу так: чем ниже падение, тем, естественно, больше рост. Вопрос в том, с чем и как сравнивать. Экономика Литвы тоже быстро растет. Но это здоровый рост, потому что спад у нас был не столь глубоким, как в Латвии.

Еще раньше, после кризиса 1998 года в России, я имела дело с МВФ, и мой опыт заключался в том, что, пока в собственной стране нет порядка, помощи ждать неоткуда — ни от МВФ, ни от каких-либо фондов или программ ЕС.

— Вы упомянули Южную Европу. Но и Испания, и Греция сильно затянули пояса. И там люди выходят на улицы протестовать. Почему в Литве этого не происходило?

— Должна сказать, что даже эти страны не принимали столь решительных мер экономии, как мы. Мы сократили расходы бюджета на 12 процентов, у нас не было иного выхода. Рынки замерли, а помощь, которую мы могли бы получить, пришла бы позже, чем нам тогда требовалось. Поэтому правительство при моей поддержке приняло ряд быстрых решений. Конечно, вопрос в том, как убедить людей в их целесообразности. Нужно начать с себя.

К примеру, мой доход сократился на 30 процентов. Были сильно урезаны зарплаты членов правительства. Если я прошу людей набраться терпения и затянуть пояса, я должна быть примером. На это должен идти любой политик, находящийся во власти. И только посредством личного примера. Тогда люди доверяют тебе, и их можно убедить еще поднапрячься, пообещав, что настанут лучшие времена. У нас результаты стали заметны через два года. И доходы понемногу снова растут. Дело в доверии между политиками и гражданами.

— Имеет ли здесь значение разница менталитетов?

— Порой мы критикуем себя за то, что излишне самокритичны, что не столь оптимистичны, как южноевропейцы. Но это не единственная причина. Недоверие между политической элитой и населением в некоторых странах Южной Европы зародилось слишком давно. Это нанесло очень сильный удар по их обществам и экономикам. У нас люди тоже не были в восторге от введенных мер экономии, но это было необходимо. И эти меры помогли нам за полтора года исправить ситуацию. Так что нам не пришлось так уж долго страдать.

— Будущее вашей страны вам представляется без кризисов?

— Думаю, с каждым годом наши дела будут идти все лучше и лучше. Мы пережили 50 лет оккупации, так что переживем и хорошие годы — я, конечно, немного шучу. Очень многое зависит от того, кто находится у власти. В Литве растет популизм, как и почти повсеместно в Европе. Вероятно, это последствие экономических трудностей. Политические партии теряют поддержку населения, поскольку не поспевают за динамикой перемен, не успевают перестроиться. А это вызывает у людей чувство неудовлетворенности. Но аналогичные процессы происходят почти везде в Евросоюзе.



Первая воскресная молитва Папы Римского

“Дорогие братья и сестры! Вы все помните известную евангельскую притчу о грешнице, которую не осудил Иисус. Наш Бог терпелив, он все нам прощает. Нам стоит помнить об этом и стремиться походить на него в этом. Если бы люди не умели прощать друг друга, они, возможно, вообще бы исчезли с земли. Нам всем стоит позабыть слова неодобрения и осуждения и чаще говорить друг другу слова любви, быть снисходительными. Научитесь прощать своих обидчиков и просить прощения сами. Будьте милосердными”.

Пабудуюць найдаўжэйшы тунэль свету

У Швецыі і Германіі працуюць над канцэпцыяй будучага марскога тунэля, які злучыць узбярэжжы абедзвюх дзяржаў. Тунэль будзе прызначаны для хуткай чыгункі паміж Стакгольмам і Берлінам. Адрэзак пад Балтыйскім морам будзе мець каля 100 км даўжыні і стане найдаўжэйшым марскім тунэлем у свеце. Цана будаўніцтва тунэля складзе прыблізна 12 млрд еўра.

Зацікаўленасць ва ўдзеле ў гэтым праекце выказалі таксама нарвежцы. Паводле іх меркавання, неабходна пабудаваць трансантынентальную чыгуначную лінію паміж Осла, Стакгольмам, Капенгагенам, Прагай, Берлінам, Мюнхенам і Венецыяй. Самы доўгі марскі тунэль на свеце злучае японскія выспы Хансю і Хакайда. Яго даўжыня — 50 кіламетраў.

ШТО ТАМ, ЗА БУГАМ?

Турыстычны бум

Польшчу летась наведала амаль 15 млн замежнікаў. Яны пакінулі тут больш за 11 млрд злотых (3 млрд еўра), падлічыў Інстытут турыстыкі.

Як паведамляе газета “Dziennik. Gazeta Prawna”, 2012 год быў рэкордным за апошнія 10 год па выдатках турыстаў і найлепшым за 5 год па колькасці турыстаў. На гэта моцна паўплываў чэмпіянат Еўропы па футболе, які зрабіў турыстычны сезон даўжэйшым.

Найбольш турыстаў прыязджае з Усходняй Еўропы і Нямеччыны. Першых за год стала больш на мільён — 4,2 млн чалавек, а немцаў — на 600 тысяч (4,8 млн).

Крызіс у Іспаніі і Грэцыі, а таксама высокія цэны на турпаездкі ў Харватыю, перанакіравалі турыстаў у Польшчу. Гатэлі тут усё яшчэ таннейшыя, чым у Заходняй Еўропе. Абед можна купіць за 10 еўра, што амаль немагчыма ў большасці краін ЕС.

У Польшчы зніжаны цэны на прадукты і адзенне

У лютым інфляцыя ў Польшчы склала 1,3%. Для параўнання: у студзені ўзровень інфляцыі склаў 1,7% — паведаміла Галоўнае статыстычнае ўпраўленне Польшчы. У лютым на ўзровень інфляцыі зрабіла ўплыў зніжэнне цэн на паслугі сувязі, вопратку і абутак, а таксама на прадукты і напоі. У лютым выраслі цэны на алкагольныя напоі, тытунёвыя вырабы, транспартныя паслугі, нерухомасць ды на паслугі, звязаныя з адпачынкам.

В российских школах появится новый предмет — “Финансовая грамотность”

Министерство финансов РФ предложило ввести в школах новый предмет под названием “Финансовая грамотность”. Сейчас ведомство готовит учебники для учащихся 1—11 классов, а первые занятия в режиме эксперимента начнутся уже осенью в пяти регионах, в том числе в Калининградской и Волгоградской областях.

Проект является частью масштабной программы Минфина “Содействие повышению уровня финансовой грамотности населения и развитию финансового образования РФ”, стартовавшей в июле 2011 года. Он рассчитан на пять лет и обойдется в 113 млн долларов (из них 25 млн долларов — заем Всемирного банка).

Учебники, по которым школьников планируется обучать финансовой грамотности, по заверению специалистов, будут носить “игровой характер”. Образовательные пособия раздадут и родителям, поскольку, по заверениям Минфина, за рубежом изучением этого предмета занимаются всей семьей.

ЧУЛІ?

У Ангелы Меркель польскія карані

Прозвішча яе дзеда Казьмерчак, ён нарадзіўся ў Познані, піша Gazeta Wyborcza”.



Цяпер зразумела, чаму Ангела Меркель так цёпла выказваецца пра Польшчу, у яе польскія карані. Так вынікае з біяграфіі нямецкага канцлера, піша „Gazeta Wyborcza”.

Ангела Меркель нарадзілася ў 1954 г. у Гамбургу. Яе дзявочае прозвішча Каснер. Ніхто нават не падазраваў, што нямецкае прозвішча раней гучала як Казьмерчак. Гэта прозвішча меў і яе бацька Хорст, які нарадзіўся ў 1926 годзе. Калі ён быў яшчэ зусім малы, то бацькі вырашылі змяніць прозвішча на нямецкае, а польскае паходжанне сям'і стала таямніцай.

Дзед нямецкага канцлера Людвік Казьмерчак нарадзіўся ў 1896 годзе ў Познані. Ён быў пазашлюбным дзіцем Анны Казьмерчак і Людвіка Вайцяхоўскага. Яго маці пайшла замуж за Людвіка Рыхліцкага. Аўтар біяграфіі “Ангела Меркель. Канцлер і яе свет” сцвярджае, што ў яе сям'і былі польскія карані.

Пасля Першай сусветнай вайны і Вялікапольскага паўстання, калі Познань перайшла да Польшчы, Казьмерчак пераехаў у Берлін. Там ён ажаніўся, і там жа нарадзіўся дзед Ангелы Меркель.

СОБЫТИЯ

«Китайская мечта»: национальный дух народа плюс уничтожение коррупции

Новый глава китайского государства Си Цзиньпин, избранный на пост председателя КНР на завершившейся сессии парламента, выступил с программной речью. В ней он заявил, что будет бороться за то, что он назвал *“великим возрождением китайского народа”.*

В связи с этим он рассказал о “Китайской мечте”. Она отныне будет главным лозунгом Поднебесной при построении *“социализма с китайской спецификой”.*

“В ходе реализации “Китайской мечты” следует развивать дух Китая. Это национальный дух, в основе которого лежит патриотизм. Это также дух эпохи реализации реформ, исходящий из стремления к национальному возрождению, построению мощного государства”, — цитируют Си многие агентства.

Одной из самых насущных и волнующих китайское обществопроблем является борьба с коррупцией, о чем достаточно открыто и четко заявил Си Цзиньпин в первом публичном выступлении перед китайскими и иностранными журналистами после съезда КПК. Он призвал чиновников Компартии Китая показать пример народу.

Главной темой коррупция стала и в выступлении премьера Ли Кэцяна. Он призвал создать антикоррупционную прозрачную систему. Партия должна вычищать коррупционеров из своих рядов, а народ должен иметь возможность в полной мере отслеживать меры, предпринимаемые государством в целях противодействия коррупции, заявил он. “Власть должна служить обществу, а не использоваться в личных интересах”, — подчеркнул новый премьер.

Ли Кэцян также пообещал передать некоторые функции правительства рынку или обществу.

Ли Кэцян родился в 1955 году в восточнокитайской провинции Аньхой. Член компартии с 1976 года. Свое продвижение по служебной лестнице начал с работы в комсомоле, которым в 1980-е годы руководил **Ху Цзиньтао.**

При “четвертом поколении” китайских руководителей успел сделать блестящую карьеру, был секретарем парткома северо-восточной провинции Ляонин, а в 2007 году вошел в состав ПК Политбюро ЦК КПК. В 2008 был назначен вице-премьером Госсовета КНР, курировал экономические вопросы.

Иван ПЕТРОВ.



Куратар аддзела млекакормячых у заапарку Чэстэра ў Англіі Цім Роўлендс корміць з рук антылопу, якая толькі што нарадзілася і ад якой адвярнулася маці.



Готовятся к кибервойне

Пентагон планирует возможные превентивные кибератаки для защиты американских стратегических интересов, сообщает Стефан Бюсар читателям Le Temps.

“Было время, когда “Аль-Кайеда” являлась наваждением для служб безопасности Америки, но теперь спектр угроз изменился, — говорится в статье. — Выступая перед Конгрессом, директор национальной разведки США Джеймс Клеппер назвал кибератаки более опасными для Соединенных Штатов, чем исламский терроризм. В тот же день президент США Обама обсуждал за закрытыми дверями проблему кибербезопасности с сенаторами. Позже он провел совещание на эту тему в оперативном штабе Белого дома. Американский президент в одном из последних телеинтервью предостерег КНР, поскольку существуют подозрения, что за кибератаками против Америки стоит именно Китай”.

Киберкомандование, созданное три года назад, объявило : перед лицом новых угроз, связанных с киберпреступностью, Пентагон создаст 40 групп (несколько тысяч гражданских лиц и военнослужащих), которые будут заниматься подготовкой возможных превентивных кибератак для защиты американских стратегических интересов.

У НИХ

У собак появился собственный телеканал

Работники телекомпаний и ученые попытались решить проблему скучающих собак, которые вынуждены сидеть дома, пока их хозяева отсутствуют. В итоге в Израиле и США появился канал DOGTV.

Исполнительный директор DOGTV Гилад Ньюманн рассказал, что контент канала, по расчетам кинологов, должен успокаивать животных и улучшать их настроение. “Мы так любим наших питомцев, что чувствуем вину, оставляя их одних”, — признался Ньюманн.

Николас Додман — специалист, подготовивший научную базу, отметил, что звук и изображение канала откалиброваны специально для собачьего уха и глаза. Картинка позволит псам забыть о депрессии из-за одиночества, которая выражается в апатии и потере аппетита.

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

Злодзеяў звычайна вешалі каля гарадскіх варот.
Разбойнікам спачатку палілі рукі, потым здзіралі са спіны палоскі скуры, рвалі цела распаленымі абцугамі, а затым — адсякалі галаву.
Жанчын, якія забівалі сваіх дзяцей, закопвалі жывымі ў зямлю і зверху прабівалі калом.
Вядзьмарак палілі на агні.
Важакоў сялянскіх паўстанняў і бунтаў спачатку саджалі на кол, затым падвешвалі за рэбры на крук, ламалі колам, чварталі, рассякаючы цела сякерай на чатыры часткі.
Якой была гісторыя смяротнага пакарання ў Беларусі?
Каго і за што каралі смерцю?
Пра гэта — у сведчаннях беларускіх гісторыкаў.

Вольга БАБКОВА:

«Смерцю каралі і за крадзеж з панскіх свірнаў...»

Гісторык Вольга Бабкова шмат гадоў працуе ў Нацыянальным архіве з самымі рознымі дакументамі. Яна нямала ведае пра смяротныя пакаранні часоў сярэднявечча.

Паны вырашалі лёс сваіх падданых без суда і следства

— Вольга, ці часта ў розных дакументах сустракаюцца выпадкі, звязаныя са смяротным пакараннем?

— У судовых актавых дакументах другой паловы XVI — сярэдзіны XVII стагоддзяў, з якімі даводзіцца працаваць найчасцей, такія выпадкі, безумоўна, сустракаюцца, бо гэта адпавядае характару судовых дакументаў. У актавыя кнігі павятовых судоў, магістратаў уносіліся не толькі натарыяльныя акты пра маёмасныя здзелкі, пагадненні паміж людзьмі, але і судовыя дэкрэты па розных крымінальных справах, сведчанні розных асоб пра абставіны злачынстваў і пакаранні за іх, якія маглі быць "грашовыя", "крывавыя", "турэмныя". Часам у судах агучваліся розныя версіі здарэння, пабачаныя з гледзішча розных сведкаў. Пісар ці падпісак у судовай канцылярыі ўсё старанна занатоўваў, часцей са слоў удзельнікаў, дзякуючы чаму зараз мы можам адчуць, апроч іншага, і моўную плынь старабеларускай мовы, уласцівай для таго часу.

— Якія з гісторый пра смяротную кару, апісаныя ў дакументах, вас найбольш шакіравалі?

— У артыкулах Статута ВКЛ 1588 года распісаны шматлікія людскія правіны і пакаранні за іх, якія былі адпаведныя тагачасным нормам права. У артыкуле 7, раздзела 11 згадваецца пакаранне, якое сапраўды шакіравала, хаця на старонках прачытаных мной актавых кніг падобных выпадкаў я не сустракала. За наўмыснае забойства бацькі або маці ці дзіцяці сваімі бацькамі вінаватага чакала "ганебная смерць" і страта пачцівасці. Злачынцу вазілі па рынку, ірвучы цела абцугамі, а пасля, пасадзіўшы ў скураны мех, садзілі туды ж сабаку, пеўня, вужаку, котку, мех зашывалі і ў глыбокім месцы тапілі... Нейкая азіяцкая манера пакарання!

Уразіла таксама і беспакаранасць пана Мікалая Шостака, які ў сваім маёнтку на Слонімшчыне ў 1576 годзе спаліў па ўласным загадзе падданую, абвінавачаную ў чарадзействе. Перад гэтым няшчасную тапілі ў рацэ. Сведчанне пра здарэнне падаў у судовыя кнігі судовы выканаўца, які прысутнічаў пры экзекуцыі. У некаторых выпадках паны вырашалі лёс сваіх падданых без суда і следства.

— Дарэчы, пра чарадзейства. Гісторык Андрэй Кіштымаў распавядаў, што вы шмат ведаеце пра тое, як каралі смерцю вядзьмарак і чараўніц...

— У кнізе гістарычных эсэ "..І цуды, і страхі", якая выйшла ў 2010 годзе ў выдавецтве "Логвінаў", ёсць раздзел "Чарадзейства", дзе згадваюцца праявы, звязаныя з чарадзействам, сустрэтыя пры распрацоўцы актавых кніг. Але ж гэтыя звесткі даволі рэдкія, сабраны практычна па крупіцах. Выпадак на Слонімшчыне, калі на вогнішчы спалілі дзяўчыну Агнешку за ваджэнне *"кола чарадзейства"* з іншымі маладымі дзяўчатамі, пра які я казала вышэй, апісаны там больш падрабязна. Хапала і іншых уяўленняў, якія тагачасныя людзі звязвалі з іншасветам, хаця найчасцей за гэтым хаваўся звычайны страх перад невядомасцю.

Перад Ратушай рэзалі горла

— Ці можна назваць гісторыю Беларусі крывавай з пункту гледжання распаўсюджвання вышэйшай меры пакарання?

— Крывавай гісторыя Беларусі была з-за свайго тэрытарыяльнага становішча, вынікам чаго сталіся шматлікія бясконцыя войны на яе тэрыторыіі. А таксама крывавай і бязлітаснай — у часы бальшавіцкага тэрору і рэпрэсій. На гэтым фоне смяротныя пакаранні напрыканцы сярэднявечча, пачатку новага часу не былі, напэўна, чымсьці выключным. Усе злачынствы, за якія чалавек "траціў горла", былі агавораны ў артыкулах Статута.

— Якія віды смяротнага пакарання былі, калі так можна сказаць, самымі папулярнымі на Беларусі: расстрэл, павешанне, адсяканне галавы ці яшчэ што-небудзь? У рэшце рэшт вынік быў адным — смерць, а віды пакаранняў розныя, чаму?

— Чалавека, які здзейсніў злачынства *("мужабойцу")*, можна было, паводле прававых норм, *"са свету згладзіць, а смерць прыправіць"* наступным чынам: *"сцяццем праз меч"*, павешаннем на шыбеніцы, чвартаваннем, саджэннем на кол.

Гэтак у Мінску на плошчы Верхняга рынку перад Ратушай у 1600 годзе быў скараны *"на горла"* праз меч мінскі мешчанін Ян Байкоўскі, абвінавачаны ў згвалтаванні жанчыны ў стадоле на Траецкай гары. Раз'юшаныя мяшчане прыцягнулі злоўленага на *"гарачым учынку"* гвалтаўніка на магістрацкі суд і, не даўшы таму *"з сумненнем сваім справіцца"*, не дазволіўшы паклікаць каплана, аддалі ў рукі кату *("містру менскаму")*.

За жорсткае забойства мінскага земскага суддзі і яго слуг, учыненага ў 1618 г. у маёнтку Хатаевічы цэлай бандай нанятых непрыяцелямі суддзі бадзяжных людзей, пакаранымі *"ўзбіццём на паль"* (на кол) аказаліся не галоўныя ініцыятары забойства, а тры чалавекі, нанятыя ў лясах на Аршаншчыне, якія прызналі сваю *"злую работу"*, свой *"злой учынак"*.

Гэтаксама за *"збіццё і змардаванне"* свайго пана ў 1618 годзе былі пакараны на смерць вязні мінскай замкавай турмы: слуга і мужык з маёнтка Бахароўскі. За *"мужабойства"* тых *"яўных злачынцаў"* прысудзілі да страты праз *"містра туташняга менскага"*: слугу — *"на горла сцяццем"*, мужыка — *"на чвартаванне"*.

Адрознасць відаў пакарання залежала ад цяжкасці злачынства. Але ж смерцю каралі і за крадзеж са свірнаў панскіх, шляхецкіх і сялянскіх, за забойства таемным спосабам — здрадліва і скрытна (з-за куста, праз вакно ці спячага...) ды іншае.

Гаспадар жа дзяржавы абяцаў, і пра гэта запісана ў Статуце, нікога не караць за завочнае абвінавачванне, нават калі б яно тычылася абразы гаспадара або дзяржаўнай здрады.

Кат працаваў гадзіну...

— Пакаранні былі жорсткія? Забівалі адразу ці спачатку прымянялі катаванні?

— Так, безумоўна, жорсткімі. І вельмі часта прымяняліся катаванні, каб здабыць патрэбную следству інфармацыю. Гэты чын называўся ў судовых дакументах *"падаць на муку", "выдаць на пробу"* кату. Артыкул 17 з раздзела 14 Статута ВКЛ агаворваў тэрмін такога катавання і ўмову, каб абвінавачаны не быў знявечаны на тым допыце. Катаванне мусіла цягнуцца адну гадзіну, і калі абвінавачаны не прызнаваўся, яго адпускалі на волю. Гэтак радашкавіцкі кат пытаў агнём баярына Амбражэя Вараніцу ў справе крадзяжу панскіх рэчаў з клеці. Але мусіў адпусціць, бо той віны сваёй не прызнаў і сапраўды аказаўся не вінаваты, як сведчаць дакументы.

— За якія злачынствы прыгаворвалі да смяротнай кары?

— *"Крывавымі ўчынкамі"*, за якія каралі *"на горла"*, лічыліся забойства шляхціца, гвалтоўны і крывавы напад на шляхецкі дом, напад на храм, гвалтаванне *"белых галоў"* (жанчын), разбой, падпал ды іншыя крывавыя справы. Аднак, як я ўжо згадвала, Статут агаворваў пакаранне і за крадзеж. Цікава, што там жа агаворвалася і магчымасць для рабаўніка, асуджанага на смерць, адкупіцца грашыма ці заступніцтвам знатных асоб, але, калі ён ужо пабываў у руках ката, то тады сярод прыстойных людзей не мог больш карыстацца шляхецкімі прывілеямі. Таксама існавала пакаранне за ўчыненае зладзейства вызнаваць свой учынак і віну перад кожным чалавекам, стоячы каля храма сваёй канфесіі шэсць тыдняў.

Дуніна-Марцінкевіча маглі адправіць на смерць?

— Ведаю, што раней за такую, здавалася б, дробязь, як падробка дакументаў, таксама вешалі...

— Так, падробка дакументаў строга каралася. *"Фальшэрамі"* называлі людзей, якія падраблялі дакументы дзеля карысных мэт. Асабліва шмат падробак дакументаў дзеля незаконнай набілітацыі (надання шляхецтва асобе простага стану) адбывалася ў XIX стагоддзі. Мінск у тыя часы лічыўся сталіцай фальсіфікацыі дакументаў. У падрабленні дакументаў падазраваўся нават Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, які меў дачыненне да адной з мінскіх натарыяльных кантор.

Гартаючы актавыя кнігі XVI—XVIII стагоддзяў, даволі часта можна сустрэць паметкі архівістаў XIX стагоддзя, якія пазначалі на палях алоўкам падробленыя дакументы. У адной актавай кнізе іх магла быць амаль палова.

— Ці былі ў тыя часы выпадкі, калі да смяротнага пакарання прыгаворвалі адказных асоб, тых, якія займалі высокія пасады? І ці заўсёды каралі тых, хто вінаваты ў злачынстве?

— З такімі дакументамі ў актавых кнігах гродскіх і земскіх судоў XVI—XVII стагоддзяў асабіста я не сустракалася, але ж, упэўнена, што падобныя рэчы маглі сустракацца, асабліва ў час ваенных падзей. Таксама ўпэўнена, што каралі і невінаватых, доказ віны якіх не быў яўны, хаця закон і агаворваў такія выпадкі. Але ж свет людзей далёкі ад дасканаласці...

— Ці можна па архіўных дакументах зрабіць выснову, хто быў вінаваты ў тых злачынствах, за якія каралі смерцю?

— Калі справа ў дакуменце выкладзена падрабязна, і калі працяг гэтай справы сустракаецца і далей у актавай кнізе, то часам робяцца відавочнымі матывы злачынства і ягоныя завадатары, а вінаватымі ў выніку маглі апынуцца ўсяго толькі выканаўцы. А часам судовая справа была такой заблытанай у праўных лабірынтах, што дасюль застаюцца цьмянымі яе вытокі.

— Вольга, а вы самі за ці супраць адмены смяротнага пакарання?

— Я катэгарычна супраць смяротнага пакарання ў сучаснай Беларусі!

Па-першае, вынясенне такога рашэння і выкананне яго наносіць удзельнікам і выканаўцам непапраўную шкоду, разбурае душу чалавека, папросту робіць душэўна хворымі, хаця гэта можа быць вонкава незаўважным. Чым больш людзей прымаюць удзел у гэтым, тым больш хворым робіцца грамадства.

Па-другое, толькі пажыццёвае зняволенне за цяжкія злачынствы можа быць сапраўдным пакараннем, бо тут ужо дакладна хопіць часу "з сумненнем сваім справіцца". Не кажу ўжо пра магчымыя судовыя памылкі...



ТЫМ ЧАСАМ

«Міжнародная амністыя» заклікае ўвесці мараторый на смяротнае пакаранне

У спецыяльнай заяве праваабарончая арганізацыя "Міжнародная амністыя" заклікае беларускія ўлады ўвесці мараторый на смяротнае пакаранне, а затым цалкам адмяніць гэты від пакарання.

"Смяротнае пакаранне з'яўляецца канчатковым, жорсткім, нечалавечым і прыніжальным пакараннем і парушэннем правоў чалавека", — сказаў выканаўчы дырэктар "Міжнароднай амністыі" па Еўропе і Цэнтральнай Азіі **Дэвіл Дыяз-Жажэ.**

У заяве "Міжнароднай амністыі" адзначаецца, што Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, дзе ўсё яшчэ ўжываюць смяротнае пакаранне.

ЦЫТАТНІК

Анатоль Шаркоў,
доктар гістарычных навук, прафесар, былы начальнік кафедры крымінальна-выканаўчага права Акадэміі МУС:

«Пакаранне смерцю магло быць простым і кваліфікаваным»

"Гісторыя пакарання смерцю на Беларусі бярэ свой пачатак са спрадвечных часоў, калі асноўнай крыніцай права было "звычаевае" права (гэта значыць права, заснаванае на звычаі), — *піша гісторык у артыкуле "Пакаранне смерцю на тэрыторыі Беларусі: гісторыя і сучаснасць", апублікаванай у кнізе "Адмена смяротнага пакарання ў Рэспубліцы Беларусь".* — На Беларусі "звычаевае" права вяршэнствавала да сярэдзіны XV ст., а затым пачало паступова выцясняцца пісаным правам, у якім шматлікія нормы "звычаевага" права атрымалі форму закона ў выглядзе шматлікіх грамат, лістоў, "прывілеяў", соймавых пастаноў, статутаў і іншых прававых актаў.

...Пакаранне смерцю магло быць простым і кваліфікаваным. Простым пакараннем лічылася павешанне ("горлам пакараць"). Прычым у старажытныя часы прысуд аб пакаранні смерцю павінен быў выконваць сам асуджаны ў прысутнасці суддзяў, якія слухалі яго пакаянне і абгавор іншых злачынцаў, пасля чага асуджаны сам лез у пятлю і вешаўся, у XVI стагоддзі каралі таксама адсячэннем галавы і расстрэлам вайскоўцамі.

Кваліфікаваным пакараннем смерцю было чвартаванне, спаленне на вогнішчы, саджэнне на кол. У гэты перыяд да простых людзей шырока ўжываліся цялесныя пакаранні — іх калечылі, білі розгамі і пугамі, што нярэдка прыводзіла да смерці. Аж да сярэдзіны XVI стагоддзя практыкавалася выдача злачынца пацярпеламу для пакарання. Крымінальныя пакаранні накладваліся з улікам саслоўяў, а пры роўным становішчы пацярпелага і злачынцы ў грамадстве — па прынцыпе "вока за вока, зуб за зуб".

Адзначаючы жорсткасць крымінальных пакаранняў старажытнага крымінальнага права Беларусі, неабходна звярнуць увагу на тое, што ў параўнанні з правам іншых еўрапейскіх дзяржаў гэтага часу яно было нават больш гуманным. Выяўлялася гэта ў непрымяненні смяротнага пакарання да цяжарных жанчын, а таксама крымінальных пакаранняў — да дзяцей і падлеткаў да 16-гадовага ўзросту, устанаўленні крымінальнай адказнасці шляхціца за забойства простага чалавека, больш высокай адказнасці за злачынствы ў адносінах да жанчын, параўнальна невялікія тэрміны турэмнага зняволення.

...У царстванне Кацярыны II у адносінах да агульных злачынстваў смяротнае пакаранне прызнавалася адмененым. Аднак гэта не тычылася надзвычайных, так званых агульнадзяржаўных, злачынстваў.

...Колькасць смяротных пакаранняў узрасла падчас рэвалюцыі 1905—1906 гадоў і вылічалася тысячамі штогод. Смяротныя пакаранні здзяйсняліся і на тэрыторыі Беларусі. Так, за замах 14 студзеня 1906 года на жыццё генерал-губернатара Мінскай губерні П.Г.Курлова на варотах турмы быў павешаны Пуліхаў. Разам з ім да смяротнага пакарання была асуджана Ізмайловіч, якая страляла ў начальніка канцылярыі губернатара. Аднак ёй камандуючы войскамі Віленскай акругі замяніў смяротнае пакаранне катаржнымі працамі..."

Адам Мальдзіс,
доктар філалагічных навук, прафесар:

«Пры крадзяжы мёду вінаватаму ўспорвалі жывот і выцягвалі кішкі...»

"Жорстка катавалі сапраўдных і ўяўных злачынцаў, асабліва з простых людзей, на допытах, — *распавядаў пра беларускія звычаі Адам Мальдзіс у артыкуле "Жорсткасць".* — Як піша ў сваіх падрабязных мемуарах Енджэй Кітовіч, у кожным горадзе Рэчы Паспалітай пад ратушай было адмысловае падзямелле з прымацаванымі да сцен жалезнымі крукамі для падвешвання і расцягу ахвяр. П'яны кат са сваім памочнікам ("гіцлем") "з усіх сіл цягнуў за шнур: вязень напружваўся, як струна, рукі выкручваліся ззаду і выпрамляліся па прамой лініі з целам над галавой, у грудзях паўставала глыбокая западзіна, куды ўціскалася галава; чалавек вісеў у паветры, не дакранаючыся табурэткі. Амаль усе рэбры, косткі, сцёгны ў ім былі бачныя, так што можна было іх злічыць, бо для пакуты вінаватых абодвух палоў распраналі дагала, абгарнуўшы якой-небудзь хусткай толькі самыя сараматныя месцы. Ад такіх пакут прызнаваліся нават невінаватыя. У адваротным выпадку пасля першага і другога "трактаў" наступаў трэці, самы цяжкі. "*Если узник прямо отрицал свою вину, накладывали ему на ноги железо, в котором были острые выступы наподобие зубьев пилы; оно состояло из двух частей, через которые по обоим концам проходили болты; этими болтами гицаль стягивал зубчатые железы, положенные сверху и снизу голеней ног; все более сжимая и искалечивая ноги, они причиняли растянутому виновнику нестерпимую боль. Мастера (палачи. —* ***Прим.пер.)*** *эти железы, похожие на дыбки, по-своему называли испанскими сапогами; не везде их употребляли, только в больших городах".*

Смяротнае пакаранне ў тыя часы было "дыферэнцыраваным". Зладзеяў звычайна вешалі каля гарадскіх варот. Пры гэтым цела (для застрашвання) не здымалі некалькі дзён, чакаючы, пакуль іх не знявечаць птушкі. Разбойнікам спачатку палілі рукі, здзіралі са спіны палоскі скуры, рвалі цела распаленымі абцугамі, а затым адсякалі галаву. Жанчын, якія забівалі сваіх дзяцей, закопвалі жывымі ў зямлю і зверху прабівалі калом. Пры крадзяжы мёду (гэта лічылася вялікім злачынствам) вінаватаму ўспорвалі жывот, выцягвалі кішкі і намотвалі іх на стол або дрэва, ганяючы вінаватага вакол. Вядзьмарак і блюзнера палілі на агні. Яшчэ больш жорстка каралі смерцю важакоў сялянскіх паўстанняў і бунтаў, змагароў за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Ворагаў феадальнага ладу саджалі на кол, падвешвалі за рэбры на крук, ламалі колам, чварталі, рассякаючы цела сякерай на чатыры часткі. Так, у 1744 годзе шматлікія ўдзельнікі Крычаўскага паўстання, у тым ліку Іван Карповіч, Стэсь Бачко, Васіль Вецер, былі жывымі пасаджаны на кол, іншыя павешаны, зацкаваны сабакамі..."

Алена Арлоўская,
кандыдат юрыдычных навук, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ:

«Смяротнае пакаранне перыядычна адмянялі»

"Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі наступіў новы перыяд у гісторыі смяротнага пакарання на тэрыторыі Беларусі. Пачынаючы з 1917 г. смяротнае пакаранне адмянялася тройчы: у 1917 г., у 1920 г. і ў 1947 гг, — *адзначае Алена Іванаўна ў публікацыі "Смяротнае пакаранне ў гісторыі Беларусі".* — Аднак кожны раз праз некаторы час пасля прыняцця актаў аб адмене смяротнага пакарання яго прымяненне аднаўлялася, што ў пэўных гістарычных умовах тлумачылася неабходнасцю ўзмацнення барацьбы з асабліва небяспечнымі злачынствамі. У адпаведнасці з Крымінальным кодэксам БССР 1928 года гэта пакаранне магло быць ужыта за здзяйсненне звыш 60 відаў злачынстваў. У КК БССР 1960 г. кола злачынстваў, за якія можна было прызначыць смяротнае пакаранне, было істотна скарочана, але ўсё ж заставалася дастаткова шырокім. Гэта пакаранне прадугледжвалася за ўчыненне больш як 30 відаў злачынстваў (уключаючы воінскія), у тым ліку і не звязаных з наўмысным пазбаўленнем жыцця чалавека".

Марына КОКТЫШ.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Сколько стоит самолет?

Не так давно в "Народной Воле" был опубликован материал о подготовке частных пилотов в Беларуси. Было написано, что многие белорусы меняют автомобили на самолеты. А напишите, пожалуйста, конкретнее, сколько стоит маленький самолет? И дороже ли он самых крутых современных машин?

Виктор ЗАКРЕВСКИЙ, Минск.



Самолеты	Автомобили
X-32 Бекас (Украина) $40.000	Porsche Boxter (Германия) от $75.000
Lambada (Чехия) от $40.000	VW Touareg (Германия) от $77.000
Як-18Т (Россия) от $80.000	BMW X5 (Германия) от $82.000
Cessna (США) от $100.000	Infiniti QX56 (Япония) $108.000
Cetus 200 (США) $130.000	Mercedes-Benz CL550 (Германия) от $190.000

Роман ВАСЮКОВИЧ.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Генпрокурор воздерживается от комментариев

Александр Конюк *не захотел озвучить позицию гособвинения по делу бывшего замминистра внутренних дел Евгения Полудня.*

Напомним, что приговор Евгению Полудню должны огласить 25 марта. Дело слушается в закрытом режиме. Почему — не ясно.

Какое наказание просил назначить Евгению Полудню гособвинитель?

"Я сам бывший судья. Никаких комментариев по делу давать не буду до приговора", — цитирует belta.by слова генпрокурора.

Сообщалось, что Полудня обвиняют в злоупотреблении властью, превышении служебных полномочий, а также получении взятки. Полудня арестовали 8 декабря 2011 года. 27 декабря он был освобожден от должности заместителя министра внутренних дел — начальника милиции общественной безопасности и уволен из органов внутренних дел Беларуси в запас с формулировкой: *"в связи с совершением проступков, дискредитирующих звание сотрудника органов внутренних дел".*

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

ЗА РУЛЕМ

Места в подземных паркингах плохо раскупаются

Об этом во время онлайн-конференции на сайте Белтелерадиокомпании заявил начальник управления жилищной политики Министерства архитектуры и строительства Беларуси ***Александр Горваль****.*

— Стоимость места в паркинге достаточно высока — порядка 15 тысяч долларов (за такие деньги можно машину приличную купить, тем более что лишних денег сегодня практически ни у кого нет), — *признает факт чиновник.* — В целом ряде домов затем отказываются от этих встроенных паркингов. Либо эти места годами не используются.

Почему такие дорогие паркинги в домах?

— Это же подземная часть с соответствующей вентиляцией, пожарной безопасностью, обеспечением эвакуации транспорта, защитой самого дома от пожаров, которые могут возникнуть при большом скоплении автотранспорта и топлива в нем, — объясняет Горваль. — Поэтому пошли сейчас по другому пути — начали строительство микрорайонных паркингов, более упрощенных систем с открытым контуром. Машино-место там дешевле. Уже несколько таких паркингов введено, и их строительство будет продолжаться. Но сама по себе проблема существует, и простого решения у нее нет...

Алина ВЕТРОВА.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

В Минске начали решать проблему парковок

Столичные чиновники обещают к чемпионату мира по хоккею 2014 года обновить улицы и построить паркинги.

Городские власти планируют провести капитальный ремонт и реконструкцию проспектов Победителей и Независимости, а также улицы Саперов. Кроме того, вблизи гостиницы "Беларусь" появится многоуровневый паркинг. Об этом говорил на оперативном совещании в Мингорисполкоме глава администрации Центрального района Минска **Олег Поскробко.**

Также к ЧМ-2014 в городе появится до 1 тысячи парковочных мест во дворах и вдоль дорог.

ВЕРНІСАЖ

Палац мастацтва імя Віталя Цвіркі

Беларускі саюз мастакоў прапанаваў прысвоіць Палацу мастацтва ў Мінску імя народнага мастака БССР Віталя Цвіркі. Пра гэта распавёў першы намеснік старшыні саюза ***Рыгор Сітніца*** *на адкрыцці выставы Цвіркі "Подых Сусвету".*

Рыгор Сітніца выказаў занепакоенасць тым, што ў параўнанні з іншымі мастакамі Беларусі імя Віталя Цвіркі не ўвекавечана ў назвах галерэй, навучальных устаноў і вуліц гарадоў.

"Адзінае, пра што я шкадую, што мала мы аддалі гонару геніяльнаму мастаку: няма да гэтага часу ў Мінску вуліцы імя Цвіркі, толькі мастацкая школа, — цытуе Сітніцу belta.by. — *Неабходна паказваць замежным наведвальнікам палотны мастака, таму што ў іх не проста найвышэйшае майстэрства, а Беларусь абсалютная, беларускі абсалютны дух у эстэтычным і маральным сэнсе".*

На выставе "Подых Сусвету", прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Віталя Цвіркі, прадстаўлена больш за 80 жывапісных твораў і акварэляў. Народны мастак Віталь Цвірка ў роўнай ступені валодаў рознымі тэхнікамі, аднак лічыцца наватарам у стварэнні эпічнага пейзажа ў беларускім мастацтве. У экспазіцыі акрамя пейзажных твораў прадстаўлены карціны ў жанры нацюрморта, якія традыцыйна адносяць да эксперыментальнай творчасці 1980-х гадоў.

Выстава "Подых Сусвету" працягне сваю працу ў Нацыянальным мастацкім музеі да 15 красавіка.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
19 САКАВІКА 2013 г.

ПОСТАЦІ

У кожнага свой Каліноўскі

*Ва ўсіх народаў свету ёсць персаніфікаваныя сімвалы Свабоды, якія сягнулі за межы свайго часу і прасторы, сталіся часцінкай духоўнага багацця чалавецтва: Спартак, Жанна д'Арк, Гарыбальдзі, Боцеў... У беларусаў гэта **КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ,** герой з герояў у Пантэоне славутых гістарычных асоб, самых адданых, самаахвярных сыноў Бацькаўшчыны. А яму ж толькі-толькі споўнілася 26, калі ён узышоў на эшафот і ўзняўся ў вечнасць.*

Так выпала, што на пачатак гэтага года прыпалі дзве знамянальныя даты, звязаныя з імем нацыянальнага героя: напрыканцы студзеня — 150-годдзе з пачатку паўстання пад зверхніцтвам Кастуся Каліноўскага, 2 лютага — 175-годдзе ад яго народзінаў. А 22 сакавіка будзе скрушны дзень чарговай, 149-й, гадавіны з дня згубы таго, хто прыняў смерць нескароным.

Як жа адзначылі нядаўнія памятныя даты-падзеі на Радзіме змагара за яе незалежнасць, калі Беларусь ужо больш за два дзесяцігоддзі мае статус незалежнай, суверэннай дзяржавы? Можна сказаць, амаль глухім афіцыйным маўчаннем. Не, пэўныя, не надта гучныя мерапрыемствы ўсё ж былі, як, да прыкладу, выстава дакументаў і выданняў аб паўстанні 1863—1864 гадоў у Навуковай бібліятэцы АН Беларусі. Зусім "без" — ужо не выпадае... Асабліва на фоне шырокіх урачыстасцяў у суседняй Польшчы, на землях якой і ўспыхнула антыцарскае вызвольнае паўстанне, падхопленае ў Літве-Беларусі.

Прыкра і сорамна, што ў нас не было ні мерапрыемстваў на высокім дзяржаўным узроўні, ні масавых грамадскіх акцый у гонар таго, на чыім прыкладзе варта выхоўваць пакаленні патрыётаў Айчыны. Які там Палац Рэспублікі ці хаця б Палац мастацтва для масавых публічных імпрэз! Апошні ператвораны ў бясконцы ўсходні базар і мядовы кірмаш. Гандаль... Дзе там месца Каліноўскаму!

Тысячу разоў, лічу, мае рацыю прафесар-гісторык **Леанід Лыч,** сцвярджаючы: *"Для кожнай улады, кожнага чалавека стаўленне да Каліноўскага — як лакмусавая паперка, што беспамылкова вызначае сутнасць "прадмета".* Не будзем казаць ужо пра царскі час, калі памяць пра пакаранага смерцю героя-ліцвіна выпальвалася калёным жалезам. Але нават у савецкія гады, пры ўсім замоўчванні гістарычнай ролі паўстання ў Мінску ўсё ж з'явілася працяглая вуліца імя Каліноўскага — ад галоўнага праспекта да цяперашняга Лагойскага тракта. Ды не так даўно яна была літаральна перарэзана "ўстаўкай" ужо з іншай назвай. Ну як жа ў такім бачным месцы беларускай сталіцы, дзе Расійская праваслаўная царква паставіла велічны гмах новага раззалочанага храма, бачыць імя "ворага Расіі"?

Праз гады і гады помніцца даўняя, напрыканцы 1980-х, маштабная і яркая мастацкая выстава ў гонар герояў Паўстання, народнае паломніцтва ў залы Палаца мастацтва. Тады хваля перабудовы, калі ў паветры пахла вясной новага Беларускага Адраджэння, усё зашумела-загуло, спарадзіла небывалы творчы ўздым. А зараз...

Наш вядомы жывапісец **Алесь Цыркуноў,** таленавіты і несупынны працаўнік на ніве мастацкага ўвасаблення гераічнай гісторыі Бацькаўшчыны, вырашыў зрабіць хаця б сціплую выставу з уласных твораў, прысвечаных адметным памятным датам. Запрасіў калег далучыцца, паказаць свае работы. І быў нямала здзіўлены, чуючы аднолькава стэрэатыпныя адказы: "Не-не, няма ў мяне нічога такога..." Адгукнуліся толькі... Міхась Карпук ды Генадзь Драздоў. Іх ранейшыя палотны "Магіла паўстанца" і "Малітва за Беларусь" хвалююць і сёння.

Куды ж падзеўся колішні творчы запал і грамадзянскі імпэт майстроў? Няўжо ліпучая філасофія горкаўскага Вужа з "Песни о Соколе" ахаладзіла высокія парыванні? Маўляў, "смешные птицы" хай хоць галавой наложаць, а "мне здесь прекрасно... тепло и сыро!". Беражы, мастак, свой талент, пішы паціху прыгожыя кветачкі-пялёстачкі, і ніхто цябе не зачэпіць...

Ды не ўсе, на шчасце, мімікравалі пад "разумнікаў-прагматыкаў", ад якіх скісае малако. Не ўсе склалі крылы. Свае карціны ў памяць і гонар паўстанцаў паказалі сябры мастакоўскай суполкі "Пагоня". І выстава, зладжаная нераўнадушным мастаком на сядзібе ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны", адбылася, сабрала нераўнадушных людзей. Яна не ўразіла знешнім маштабам — усяго крыху больш за дзясятак жывапісных палотнаў у невялікім — іншага няма — памяшканні. Але тым болей гонару і ўдзячнасці творцу, які ні пры якіх вятрах не збочвае са свайго шляху.



У Алеся Цыркунова — свой Каліноўскі. Партрэтыст шукае не столькі дакладнага знешняга падабенства з вядомай фатаграфіяй, зробленай сучаснікам Каліноўскага — рэвалюцыянерам Ахілесам Джузэпэ Банольдзі, колькі пранікнення ў глыбокі ўнутраны свет героя ў час напружанага роздуму. Мастак бачыць у сваім — і народным — героі не безразважнага, хай і ахопленага высокімі памкненнямі, рамантыка-донкіхота, а мысляра і змагара, які робіць — ужо зрабіў! — свой нялёгкі, ды адзіна магчымы, узважаны і вынашаны ўсёй істотай выбар. Лёсавызначальны выбар пры ясным усведамленні: зусім не ўяўным ворагам — ветракам — ён кідае выклік. Перад ім і ягонымі паплечнікамі — магутная сцяна, агромністая бязлітасная сілішча. І магчымая, вельмі верагодная гібель... Цяжка адарвацца ад гэтых вачэй на партрэце, схопленых мастаком у момант, калі цяжкае рашэнне ўжо прынята і прыходзіць унутраны спакой. Верыцца, ён і насамрэч быў такі, наш Кастусь.

На пытанне мастаку, калі ён упершыню ў сваёй творчасці сустрэўся з Каліноўскім, той прызнаецца:

— Па праўдзе, дык не адразу, хаця змоладу мяне вабіла героіка мінулых часоў. Пісаў персанажаў расійскай гісторыі, дыпломную работу прысвяціў дзекабрыстам...

— А ў цябе няблага выходзіць, — падбадзёрылі тады старэйшыя таварышы. — Толькі, май на ўвазе, у нас і свае, беларускія, героі ёсць. Ды яшчэ якія!

Свае? Беларускія? Ніколі не чуў — ні ў школе, ні на інстытуцкіх лекцыях. Але зачапіла. Стаў распытваць, шукаць — і знайшоў добра прыхаваныя ад людзей крыніцы. Усплыла ў памяці ўжо забытая карцінка з майго вясковага дзяцінства: па вёсцы, з хаты ў хату, перадаецца нейкая зжаўцелая, немаведама як трапіўшая да нас кніжачка пра "мужыцкага праўдыра". Казалі: ён жа за нас быў, за нашу зямлю і волю... А потым столькі ўсяго адкрылася! І я даўно ўжо з галавой акунуўся ў гэтую тэму, жыву ёю.

Творца падзяліўся пераканаем: лічыць памылковым маляваць народнага заступніка, выказніка народных памкненняў і мар адзінокім багатыром у чыстым полі. Ён узрос пад духоўным уплывам брата Віктара, на ідэях расійскіх дэмакратаў Чарнышэўскага і Дабралюбава, якія з надзеяй чакалі, "что скажут сами белорусы", на гістарычных узорах Вялікай французскай рэвалюцыі 1789 года, на ўроках адважных папярэднікаў — змагароў за Бацькаўшчыну. Запаліў сваю паходню ад агню паходні Тадэвуша Касцюшкі, паўстанцаў 1794-га і 1831 гадоў. Многія з іх, здолеўшы ўзняцца над саслоўнымі дваранска-шляхецкімі прымхамі, пакінулі свае ўтульныя родавыя гнёзды, каб вярнуць сваю самую каштоўную спадчыну — незалежную дзяржаву, Вялікае Княства Літоўскае, якое паглынула больш магутная суседка — Расійская імперыя ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай напрыканцы XVIII стагоддзя. Шмат хто ўжо не вярнуўся да роднага парогу. Як і Кастусь, паклалі жыцці на алтар Айчыны ці апынуліся ўдалечыні ад яе ў вымушаным выгнанні. Іх імёны, іх подзвігі апеты ў народных паданнях, годна ўганараваны ў іншых краінах свету. Глядзіш на іх адухоўленыя выявы, што ажылі пад пэндзлем Алеся Цыркунова і думаеш: якія ж мы багатыя!

Вось яны: славуты стваральнік вядомага і любімага ўсімі музычнага шэдэўра — паланэза "Развітанне з Радзімай", кампазітар і ваяр Міхал Клеафас Агінскі... Чароўная красуня з паэтычным складам душы і глыбокай захопленасцю народным мастацтвам Эмілія Плятэр — паўстанцкі камандзір у чыне капітана, за якім смела кідаліся ў вір бітвы суровыя мужчыны... Гарачы прыхільнік абвяшчэння Літвы-Беларусі дэмакратычнай рэспублікай і надзялення сялян зямлёй, роўнасці палітычных правоў для ўсіх Міхал Валовіч, што кінуў бестурботнае жыццё ў Парыжы і ў лясной смалакурні на Слонімшчыне, у бацькоўскім фальварку, зрабіў базу створанага самім жа партызанскага аддзела інсургентаў. Як Каліноўскі і ў ягоным узросце, загінуў — толькі на тры дзесяцігоддзі раней — ад царскай пятлі...

А якія паплечнікі былі разам з Каліноўскім у тым агні! Будучы герой Парыжскай камуны Валеры Урублеўскі, мастак Альфрэд Ромэр... Не толькі словам, а і справай падтрымалі паўстанне пачынальнікі новай беларускай літаратуры — сёння ганараваныя класікі — Францішак Багушэвіч і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч з дачкой Камілай, вельмі пацярпелыя ад пераследу царскіх улад.

— Нам трэба, вельмі трэба ўваскрашаць для сучаснікаў вобразы ўсіх, хто палёг за свабоду, — лічыць прафесар і грамадскі дзеяч **Юры Хадыка**. — *Чаго варта хаця б геройская асоба Рамуальда Траугута — расійскага афіцэра-артылерыста, які свядома прыйшоў да паўстанцаў і камандаваў узброеным гарматамі атрадам на Кобрыншчыне і Піншчыне, атрымліваў бліскучыя перамогі над царскімі карнікамі. Мала, вельмі мала ведаем зараз пра іх...*

— Дзеля таго каб ведалі, помнілі і ганарыліся, шмат зрабілі нашы выдатныя, таксама адважныя, гісторыкі-сучаснікі, асабліва Генадзь Кісялёў (ён нядаўна пайшоў у іншы свет — вечная яму памяць і ўдзячнасць), — выказаўся знаны пісьменнік-архівіст **Язэп Янушкевіч**.

Падчас мастацкай прэзентацыі ў ТБМ адбылася і прэзентацыя ягонай новай кнігі "ТВАРАМ ДА ШЫБЕНІЦЫ", дзе ў поўным варыянце публікуюцца ўсе сем нумароў "Мужыцкай праўды" і "Лісты з-пад шыбеніцы" самога Кастуся Каліноўскага. Там усё, чым гарэла і да чаго імкнулася яго душа, як на далоні. Можна, бадай, сказаць, што гэта — аўтапартрэт асобы "апошняга караля Літвы", які непасрэдна, напрамую звяртаецца да загнаных у галечу і бяспраўе мужыкоў, адчувае іх сваімі братамі, расплюшчвае ім вочы на корань усіх бед, абуджае прагу вызвалення з каланіяльнага рабства ў Расійскай імперыі. Толькі разам з воляй здабудзеш сваю зямлю, станеш гаспадаром і чалавекам — вось што палымяна казаў і перакананa даводзіў ён знявечанаму працоўнаму люду ў сваёй "Мужыцкай праўдзе" — першай беларускай незалежнай дэмакратычнай газеце. Пазбаўленне ад імперскага ярма, надзяленне гаротных сялян зямлёй — вось яго праўда. На вялікі жаль, не паспела яна тады дайсці да ўсіх і кожнага.

Але нашчадкі, нарэшце, маюць магчымасць чытаць нязгаснае слова Праўды і браць яго ў свае сэрца. Праўда непераможная, і ніякія злосныя міфы хлуслівай прапаганды не ў сілах яе адолець, заплямiць. Рэальныя факты — самы надзейны шчыт.

Карпатлівы даследчык Язэп Янушкевіч у прэзентаванай кнізе дакументальна абвяргае гнюсныя інсінуацыі, што цягнуцца за светлым імем з даўніх часоў да нашых дзён, згадвае: *"На допыце ў жандарскіх палкоўнікаў у адным са сваіх тлумачэнняў уласных поглядаў Каліноўскі ясна напіша: "Я НЕ ПРАЦІЎНІК ШЧАСЦЯ НАРОДНАГА, НЕ ПРАЦІЎНІК І РАСІІ, КАЛІ ЯНА НАМ ДАБРА ЖАДАЕ, АЛЕ ПРАЦІЎНІК ТЫХ БЕДСТВАЎ, ЯКІЯ АБРУШВАЮЦЦА НА КРАЙ НАШ НЯШЧАСНЫ".* Сапраўды, ці не ясней яснага? І як сугучна таму, чым жывём мы сёння, чым трывожымся і аб чым марым. У гэтым несмяротнасць вялікага сына Беларусі, які з мужнай годнасцю стаяў тварам да шыбеніцы, паспеўшы паставіць подпіс "Яська-гаспадар з-пад Вільні" пад апошнімі перадсмяротнымі словамі яго ліста да народа. Вось яны: *"Браты мае, мужыкі родныя... Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе... Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, но не жаль згінуць за тваю праўду".*

Не, не згінуў Кастусь! І не можа згінуць. Каліноўцамі называюць сябе сённяшнія маладыя патрыёты, не выракаючыся святога бел-чырвона-белага сцяга нават за кратамі.

Вобраз самаахвярнага ваяра за волю і народную долю, за незалежную Беларусь натхняў і натхняе паэтаў і пісьменнікаў цягам дзесяцігоддзяў. У сваёй кнізе Язэп Янушкевіч падае ўнушальную "Паэтычную Калінаўскіяну" — анталогію вершаў і паэм з-пад пяра 55 аўтараў! Пад адной вокладкай — славутыя і не надта вядомыя імёны творцаў ад 20-х гадоў мінулага веку да сённяшніх дзён: Максім Танк і Міхась Машара, Ларыса Геніюш і Наталля Арсеннева, Уладзімір Караткевіч і Пімен Панчанка, Валеры Маракоў і Аркадзь Куляшоў, Рыгор Барадулін і Ніл Гілевіч... У кожнага, зразумела, свой Каліноўскі. Але думка, выказаная вершам Анатоля Сыса *"ТЫ З НАМІ, ТЫ З НАМІ, БРАЦЕ!"* — адна.

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.


РЕЙТИНГ

Рванули вверх

В рейтинге ООН по индексу человеческого развития Беларусь поднялась на 15 позиций и заняла 50-е место среди 187 стран. Это третья позиция в группе стран с высоким уровнем человеческого развития.

Индекс человеческого развития исчисляется, исходя из трех показателей — ожидаемая продолжительность жизни, средняя продолжительность обучения и валовой национальный доход.

В последнем представленном ранее рейтинге Беларусь занимала 65-ю позицию.



"По сравнению с прошлым докладом мы "прыгнули" вверх на целых 15 позиций, — комментирует координатор информационной деятельности ПРООН в Беларуси **Владислав Хилькевич**. — *Что у нас существенно изменилось, так это ожидаемая продолжительность обучения. Цифра изменилась с 9,3 года до 11,5 года на среднестатистического белоруса. Средняя продолжительность увеличилась больше чем на два года. Все остальные показатели изменились незначительно".*

Возглавляют рейтинг Норвегия, Австралия и США. Среди бывших советских республик к группе с очень высоким уровнем человеческого развития относятся Эстония (33-е место), Польша (39-е), Литва (41-е), Латвия (44-е).

В группу с высоким уровнем человеческого развития относятся кроме Беларуси Россия (отстает от нас на пять позиций и занимает 55-е место), Казахстан (69-е место), Грузия (72-е место), Украина (78-е место), Армения (87-е).

В группе со средним уровнем развития — Туркменистан, Молдова, Узбекистан, Кыргызстан, Таджикистан.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Паўфіналісты

Учора ў сталічным Доме футбола прайшла жараб'ёўка 1/2 фіналу Кубка Беларусі па футболе.

Барацьбу за ганаровы трафей працягваюць мінскія "Дынама" і СКВІЧ, "Мінск" і жодзінскае "Тарпеда-БелАЗ".

Паўфінальныя гульні прызначаны на 3 красавіка, а фінальны матч Кубка Беларусі — на 26 мая.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Сколько калорий в чашке кофе?

В последнее время стала увлекаться кофе. Выпиваю несколько чашек в день. А еще очень люблю капучино, и если встречаемся с подружками в кафе, то часто его заказываем. Но при этом я почти всегда на диете. Мне интересно, сколько калорий в чашке кофе?

Ольга ПЕТРОВИЧ.

г.Барановичи.



СЛЫШАЛИ?

Хлебозавод №1 в центре Минска снова выставлен на продажу

В апреле столичные власти попытаются продать с молотка хлебозавод №1, который расположен на улице Раковской в историческом центре Минска.

Сообщение о проведении конкурса появилось на сайте Мингорисполкома. Торги должны были состояться еще 29 декабря минувшего года, однако были отменены. Начальная цена предприятия не изменилась и составляет 125.599.842.986 рублей, что эквивалентно 14,6 млн долларов.

Как сообщает realt.onliner.by, победитель торгов, назначенных на 26 апреля, будет обязан выполнить ряд условий: строительство новых объектов на месте завода должно вестись в соответствии с планами по развитию исторического центра Минска. В течение трех лет с даты подписания договора купли-продажи новому владельцу предстоит вложить в проект инвестиции на сумму не менее 13 млн долларов. Кроме того, в течение двух лет необходимо сохранять магазины по ул.Раковской, 25, и ул.Раковской, 30, а до конца 2013 года — арендные отношения с КУП "Минскхлебпром" на помещения в зданиях по ул.Витебской,17, и ул.Раковской, 23б.

Минский хлебозавод №1 введен в эксплуатацию в 1927 году. Сегодня здесь выпекается 70 тонн хлебопродуктов в сутки и работает более 520 человек. После продажи предприятия производство будет закрыто.

Ранее компания "Трайпл" намеревалась построить гостиничный комплекс на территории хлебозавода №1. В интернете мелькал эскизный проект реконструкции квартала. Однако затем от проекта решено было отказаться.

Теперь архитекторы планируют с помощью инвестора воссоздать на этой территории застройку кварталов конца XIX века.



СЕКРЕТЫ УСПЕХА

Михаил ЧЕЧЕНЕВ, гендиректор ОАО «Пивзавод Оливария»:

«Недостаток профессионализма можно простить, а отсутствие порядочности — никогда»

Почему лучше застрелиться, чем начать выпуск нового продукта питания на белорусском рынке?

Сколько часов в сутки нужно не спать, чтобы стать успешным бизнесменом или управленцем?

И зависит ли успех в карьере от количества дипломов?

*На эти и другие вопросы в рамках образовательного проекта "AlterEDU" ответил генеральный директор ОАО "Пивзавод Оливария" **Михаил Чеченев.***

Журналист "Народная Воля" побывала на этой встрече и записала некоторые рассуждения управленца о том, как достичь успеха в бизнесе.



Когда спать не хочется

— Долго рассказывать о себе не буду, — сразу сказал Михаил Чеченев. — *Для того чтобы добиться успеха, нужно работать по максимуму.*

Михаил Чеченев с красным дипломом окончил Ростовский государственный университет, карьеру начал на одном из местных предприятий. Как офицер запаса принимал участие в ликвидации последствий чернобыльской аварии, после чего остался в Беларуси. Работал на руководящих должностях Минского производственного кожевенного объединения. Занимался бизнесом. Позже, успешно пройдя собеседование, был приглашен на работу в компанию "Coca-Cola".

По его словам, не нужно откладывать на потом то, что можно сделать сейчас. А фраза *"когда мне будет нужно, я это освою"* вызывает у гендиректора ОАО "Пивзавод Оливария" непонимание.

— Я стажировался в Германии, — говорит Чеченев. — *Нас учили по 12 часов в сутки. Считаю, если вам дают возможность получить знания — получайте их все.*

По мнению Чеченева, наличие высшего образования не гарантирует дальнейшего успеха в карьере. И количество дипломов никак не связано с качеством знаний.

— Университетское образование дает человеку возможность работать с информацией, — высказывает он свою точку зрения.

Сколько часов в сутки нужно спать (или точнее, не спать), чтобы добиться успеха в бизнесе? Михаил Николаевич убежден: "*Когда есть интересное дело, спать не хочется".*

— Мой рабочий день длится с 8 утра до 8 вечера, — делится он. И добавляет, что спит не больше 6 часов в сутки.

Гендиректор "Оливарии" обращает внимание: на пути к успеху важно не пропустить те сигналы, которые подсказывает сама жизнь каждому из нас. Помимо этого, нужно относиться к работе с максимальной отдачей и не жалеть собственных сил.

Кстати, самым главным в любом специалисте Чеченев считает не профессионализм, а порядочность.

— Недостаток профессионализма можно простить, это приходит с опытом, — считает Михаил Николаевич.

Время — деньги

На встрече Михаила Чеченева попытались обвинить в спаивании молодого поколения. На вопрос, не грызет ли его за это совесть, гендиректор пивзавода ответил так:

— Официально заявляю: нет, меня не грызет совесть. Точно так же, как и производителей автомобилей. Сколько людей погибает на дорогах?

По его мнению, пиво — тот продукт, который может доставить удовольствие или... вынуть из человека мозги полностью. Здесь уж, как говорится, выбор каждого...

У Михаила Чеченева спросили, насколько сегодня сложно открыть собственное производство продуктов.

— Если у вас нет собственного предприятия и вы хотите выпускать продукцию, то лучше застрелитесь, — судя по всему, максимально честно ответил управленец. — *Выпуск нового продукта на рынок занимает шесть месяцев... Я могу много говорить о разных проектах, объяснять, что к чему, но — за отдельные деньги. Так как все это займет много моего времени, которое дорого стоит...*

Роман ВАСЮКОВИЧ.

Досье «Народной Воли»

Михаил Чеченев родился в 1961 году в семье военнослужащего на Урале, до переезда в Беларусь жил в Ростове-на-Дону. Работал в компании Coca-Cola на различных должностях, связанных с обеспечением технического руководства и контроля качества в Украине, Беларуси, России. В течение пяти лет занимал должность директора предприятия "Вителла" — дочерней компании немецкого концерна Schwartau-Hero в Беларуси. На "Оливарии" начал работать в конце декабря 2007 года в должности замгенерального по производству. Через два года возглавил ОАО "Пивзавод "Оливария".

Пивзавод был основан в 1864 году и является старейшим действующим пивоваренным производством Беларуси. "Оливария" — один из лидеров пивоваренной отрасли Беларуси. Контрольный пакет акций компании принадлежит Carlsberg Group — четвертой по величине пивоваренной группе в мире.

ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ

Анжаліка Агурбаш восенню выходзіць замуж

Пра гэта паведаміў расійскім журналістам артыст Мікалай Баскаў.



Падчас шоу Валянціна Юдашкіна, у якім удзельнічала Анжаліка, Баскаў абвясціў: *"Анжаліка вартая лепшага мужчыны, і ён — побач! Восенню вяселле!"* У свецкай тусоўцы палічылі, што Баскаў сам вырашыў ажаніцца з Агурбаш. Аднак той у сваім Твітэры расставіў кропкі над "і": "*Я не жаніх, а вядучы на вяселлі Агурбаш, якое адбудзецца восенню!!!"*

Як паведамляла "Народная Воля", у апошні час Анжаліку Агурбаш часта бачылі ў кампаніі казахскага бізнесмена Анатоля Пабіяхі.

Анатоль на год маладзейшы за Анжаліку — яму 41 год, ён адзін з самых паспяховых бізнесменаў Казахстана і заснавальнік холдынгу Line Group. У яго ўваходзяць крамы сантэхнікі сусветнага класа Villeroy & Boch, мэблі аўтарскага дызайну Ligne Roset. Асобны напрамак Line Group — сетка рэстаранаў Line Brew і "Казахстанская піўная кампанія".

Аліна ВЕТРАВА.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Ад Мінска да Парыжа далёка

Але да "парыжскага" кафэ дабрацца можна

Тым больш што яно адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі. Маленькая зала, вялікая кава-машына, венскія крэслы, столікі на дваіх...

Ідэя даўно насілася ў паветры — ва ўсякім выпадку дырэктар музея **Уладзімір Пракапцоў** не раз агучваў яе як сваю мару. Ён заўсёды лічыў, што нават такому самавітаму храму мастацтваў патрэбны інтымны куток: каб пасля сузірання карцін сесці і паглядзець адзін на аднаго і на астатніх гледачоў. Мастацтва, ведаеце, зbліжае...

А тут такі зручны выпадак: пасля гучнай выставы з калекцыі "Белгазпрамбанка" "Мастакі Парыжскай школы" банк пакінуў музею "парыжскае" кафэ, якое было зроблена, каб больш прывабіць публіку да карцін. Цяпер абсталяванне перададзена ў арэнду аднаму з мінскіх камерсантаў — дарэчы, калекцыянеру і сяброу апякунскага савета музея. Ён будзе займацца матэрыяльнай часткай кафэ: кававымі зернямі і — спадзяёмся! — свежымі круасанамі. А музей абяцае напоўніць гэты куток інтэлектуальнымі мерапрыемствамі: камернымі канцэртамі, дэманстрацыяй дакументальных фільмаў пра мастацтва, творчымі сустрэчамі з мастакамі.


Алена МАЛОЧКА.

НАКАНУНЕ

Второй «Щелкунчик»... Но зато первый Купер!

Через две недели в Большом состоится премьера балета П.И.Чайковского "Щелкунчик". Это будет второй "Щелкунчик" в театре, и он будет жить в афише наравне с первым, поставленным Валентином Елизарьевым еще в 1982 году.

Стоило ли тратиться на новую постановку, когда в репертуаре уже есть прекрасный спектакль? Стоило. Второй спектакль нужен театру, чтобы, уезжая на предновогодние гастроли (а Европа накануне Рождества желает смотреть прежде всего "Щелкунчика"), оставить и белорусским зрителям любимую философскую сказку Гофмана и Чайковского. Что ж, практика не новая. Идет же в Большом театре России два "Бориса Годунова".



Юрий Купер.

Спектакль ставит новый балетмейстер нашего театра **Александра Тихомирова**, приехавшая к нам из Санкт-Петербурга. Человек талантливый (работала в Мариинском театре и балетной труппе Якобсона), но белорусской публике пока не известный. Как говорится, масштаб творческой персоны постановщика покажет премьера.

А вот сценографию "Щелкунчика" делает знаменитый художник, человек мира — живет то во Франции, то в Лондоне, то в Нью-Йорке, то в Москве — великолепный **Юрий Купер** (кстати, именно он выступал художником второго спектакля "Борис Годунов" для Большого театра Москвы, а постановщиком был не кто иной, как **Александр Сокуров**).

Итак, на спектакле нас ждет встреча с мастером. Работы Купера хранятся в Третьяковской галерее, музее Метрополитен, в коллекциях Министерства культуры Франции и Библиотеки конгресса США. Его сценография для белорусского "Щелкунчика", как рассказывают в театре, изобилует новыми уникальными технологиями и обещает потрясти белорусский театральный мир. Но показывать эскизы заранее отказываются — плохая примета.

Что ж, поверить пока на слово нам, зрителям, нетрудно. Известно, что живопись и скульптура Юрия Купера пользуется немалым успехом у коллекционеров по обе стороны океана. Ценовой диапазон — 10—30 тысяч евро. Аукционный рекорд для творчества художника — 18,5 тысячи фунтов за полутораметровый живописный "Тюльпан", уплаченные на Phillips de Pury летом 2008 года. Как говорят искусствоведы, шикарная работа.

Но какой гонорар запросил тогда Юрий Купер у нашего Большого? Как сообщил источник в театре, господин Купер получит такое же вознаграждение, как получили бы отечественные художники, не больше. На белорусский гонорар знаменитый художник согласился, потому что считает работу над минским "Щелкунчиком" делом сердца. Благородно. А умению администрации Большого театра приглашать работать "за дружбу" можно только аплодировать.

Елена МОЛОЧКО.

ОТКРОВЕННЫЙ РАЗГОВОР

Женское счастье Ирины Лепарской

О любви и простом человеческом счастье, добре и зле, красоте и предательстве корреспондент "Народной Воли" беседует с главным тренером сборной Беларуси по художественной гимнастике ***Ириной ЛЕПАРСКОЙ.***



С мужем Александром.

Вся комната в спорткомплексе "Динамо", где мы беседуем с Ириной Юрьевной, заставлена подарками.

— Я некоторые даже не распечатывала еще, — признается она. — Это и меня поздравили, и я должна девочкам отдать сувениры...

Начинаем разговор мы с раннего.

— Не сказала бы, что детство у меня было тяжелое, — вспоминает Ирина Юрьевна. - Родилась я в Новороссийске. Жили мы нормально. Правда, папа умер, когда я была в 7-м классе. Может быть, маме и тяжело было меня растить, но я этого не замечала. Тренировалась, училась в музыкальной школе, хорошие оценки были в общеобразовательной.

— Семья не бедствовала?

— Прилично зарабатывал папа, потому что он был помощником капитана. Ходил в море, в "загранки". Мама была дома. Когда папа умер, она пошла работать диспетчером в автохозяйство. Я — единственный ребенок в семье, отец был очень щедрый. Все, что зарабатывал, он тратил на нас и своих друзей. Был очень общительный, хлебосольный. Мог, например, весь мой класс вывезти на катере в море или заказать на весь двор шашлыки, после чего гуляла вся околица. Жили мы в семейном общежитии, и папа все время тщетно пытался отложить деньги на кооператив, но так и не собрал. Может быть, у него было уже тогда предчувствие, что жизнь будет недолгой. Он умер в 40 лет, но прожил широко, на полную катушку... Помню, говорил маме: "Построим мы кооператив — и что? Что в этом хорошего? Закрыться в квартире и людей не видеть?"

— Единственную дочку отец, наверное, баловал подарками, деньгами?

— Да нам тогда деньги особо и не были нужны. Это сейчас море соблазнов, а раньше... Я стеснялась что-то просить, но папа сам делал подарки. Когда он привез мне куклу с соской во рту, такой не было ни у кого. И эта кукла постоянно стояла у меня на пианино как самый дорогой подарок. Сильно не баловали, хотя были возможности иметь все самое лучшее из-за границы. Типа колготок или болоневого плаща...

— Вы не были модницей?

— Я имела все, что только появлялось в Союзе, потому что все это можно было покупать за чеки в "Березке". Когда мне захотелось пианино, его купили в тот же день. Я не просила, просто упомянула об этом... Пришла из школы домой, а пианино уже распаковывают.

— Подруги вам, наверное, завидовали?

— Нет, воспоминания о детстве в Новороссийске у меня остались самые светлые. Я с этими подружками дружу до сих пор... А затем была гимнастика, обязательное распределение, Смолевичи. Условия там были — просто ужас! В Минск ездила на электричке и на попутных машинах, потому что в Смолевичах вообще негде было жить. А в столице жила у Лиды Горбик — в прошлом нашей известной гимнастки. Она получила в то время квартиру в Зеленом Луге. Я садилась на попутку, знакомый милиционер, который водил дочку на гимнастику, помогал мне добраться до Минска. Но положенные три года я не отработала. У меня даже в трудовой книжке есть запись: "Исключена из списков работников ДЮСШ как самовольно оставившая работу". Все правильно. Я забрала Марину Лобач и уехала в Минск, когда появилась возможность устроить ее в интернат. Привезла в столицу трех девочек.

— А зарплату свою первую помните?

— Получила 90 рублей. Очень долго мне платили такую сумму, затем на червонец зарплату повысили.

— Хватало?

— А в Смолевичах не на что было деньги тратить. На попутках в Минск ездила бесплатно, тратить было негде. После развала Союза, я хорошо помню, получала 100 долларов. Тогда очень многие белорусские тренеры разъехались по миру, прожить на эти деньги было сложно. Но мы ведь не погибли. Выжили.

— Когда вышли замуж, наверное, легче стало в бытовом плане?

— Конечно, вдвоем всегда легче в большом городе. Я раньше ходила по Минску, смотрела на окна и думала: "Господи, сколько окошек в квартирах! И хотя бы одно было мое". С Лепарским мы десять лет блуждали по съемным квартирам. За год иногда меняли место жительства 2—3 раза. Когда поженились, муж был еще студентом.

— Вас не смущало тогда, что муж моложе на четыре года?

— Абсолютно не смущался. Он добился меня, приезжал каждый день в Смолевичи. Саша говорил: "У меня в жизни были три мечты. Стать директором завода, иметь служебную "Волгу" и жениться на тебе. Но директором быть уже не хочу, "Жигули" есть, а на тебе я все равно женюсь". Сопротивляться его напору я не могла. Но и Саша старался для семьи. Чем он только не занимался! И бензин возил, и какие-то шины красил... По распределению пошел работать на шарикоподшипниковый завод, вкалывал там за троих. Очень машину хотел купить. И купил. Красненькие страшненькие "Жигули". Я эту машину как увидела, чуть в обморок не упала. Говорю ему: "Саша, а ты вообще уверен, что она будет ездить?" — "Все у нас будет", — отвечает. Но в свою собственную квартиру мы переехали только в 1991 году.

— Я знаю, что жили вы в тесноте, но не в обиде. Даже трех гимнасток на квартиру взяли…

—- А куда им было деваться? Вот и поселились у нас Лариса Лукьяненко, Оля Гонтарь и Лена Иванова. Лена меня вообще умиляла. Однажды я приехала домой с каких-то соревнований и просто поразилась — кругом была такая чистота! В воздухе стоял приятный запах жареных котлет, по кухне ходила Лена с закрученным на голове полотенцем, а на столе лежала записка: "Александр Валентинович, обед на плите. Соблюдайте чистоту". Это Лена Иванова оказалась такой заботливой.

— Не утомляло девочек после тренировочного зала видеть вас еще и дома?

— Тренировка — это тренировка, а дом — это дом. Да вот Лариса Лукьяненко и сейчас рядом со мной. Она тоже тренер, у нее самой уже трое детей.

— А с мужем вы сколько уже вместе?

— С 1981 года.

— Ревнивый?

— Нет, конечно. Если бы был ревнивый, куда бы я ездила с командой? Да и я — однолюб. Мне в этой жизни ничего менять не надо, все устраивает. Судьбой начертано. Это все — моя большая семья. Плюс к этому мы очень сильно подружились с семьей Андрея Иманали, и никакие невзгоды на меня не повлияли. *(Андрей Иманали в свое время был вице-президентом Белорусской федерации гимнастики, но затем попал в криминальную историю —* **Авт.**). Младшая дочь Андрея — Андрианочка — моя крестница и мое любимое создание в этой жизни. Жена Андрея Вика долго не могла родить, я ездила к Стене Плача в Иерусалим, была у Гроба Господнего, просила, молилась... Все сложилось счастливо.

— Иина Юрьевна, а девочки-гимнастки в свои счастливые моменты жизни приглашают вас на свадьбы?

— Конечно! Ездили с Лепарским в Москву на бракосочетание к Лене Шаматульской, у Светы Рудаловой были.... Жаль, что не удалось побывать на свадьбе у Инны Жуковой, нас не было в Минске.

— Как-то вы сказали, что браки в гимнастике очень редко сохраняются долго…

— Не помню, чтобы я такое говорила, у моих гимнасток все долговечно.

— Некоторые из девочек на вас, наверное, обижаются за требовательность? Вот у Юлии Раскиной были в свое время такие обиды…

— Да, Юля была обижена, и сколько я ни пыталась объяснить ее маме ситуацию, меня не хотели слушать. Но сейчас у Юли все в порядке, она родила мальчика, работает в цирке. На каком-то цирковом конкурсе завоевала награду... Юля Раскина рождена борцом, у нее такой характер, что постоянно любит выигрывать. И, возможно, правильно сделала, что ушла в цирк, чтобы найти свою дорогу в жизни. Она цеплялась за гимнастику, считала, что только она одна хорошая, но у нас так не бывает. Должна быть смена поколений, и на место Юли пришла Инна Жукова. Жизнь показала, что я была права, хотя многие очень сильно критиковали меня за то, что я привезла из России Инну.

— Называли спортсменку "никакой"…

— И эта "никакая" затем всем показала, чего она стоит. На Играх 2004 года Жукова была 7-я, это было признано провалом. Но я-то знала, что это не провал, а чудо! Потому что за три года подняться с 28-го места российского первенства до 7-го в мире — это величайшее достижение. А позже пошли и медали... Но для всего нужно время. Вот на нас в Министерстве спорта иногда обижаются. Говорят: вы должны все больше и больше давать медалей, нельзя идти на понижение результата. Вы не планируете две медали в Рио-де-Жанейро?

А я вообще преждевременно ни на кого из гимнасток медали не вешаю. Той же Мелитине Станюте нужно создать конкурентоспособную среду, чтобы она росла в мастерстве. Как говорит Ирина Винер: "Дуб растет среди дубов". Художественная гимнастика — это очень тяжелый вид спорта. Из маленького ребенка нужно вылепить "звезду". Думаете, это просто?

— Муж вам помогает в работе?

— Конечно, он через стенку работает фитнес-инструктором. Без его клуба мы бы просто задохнулись. Дети уже привыкли к этому залу, это для них третья тренировка. Муж даже заставляет девочек в солярий ходить. Говорит им: "Видел по телевизору, что у вас ноги какие-то синие. Идите и позагорайте".



Победа — одна на всех.

— А квартиры для гимнасток вам приходится выбивать? Участвовать в решении каких-то бытовых проблем?

— Не без этого. И Инна Жукова, и Света Рудалова, может быть, ничего и не получили бы, если бы в нужное время в нужном месте я не вставила бы, как говорят, свои пять копеек. Кстати, квартирный вопрос для Любы Черкашиной остается еще открытым... Но почему-то после Олимпиады в Лондоне, где Люба завоевала медаль, все застопорилось. Но я так просто своих детей не оставлю, буду бороться за них, потому что они это заслужили. Это по телевизору все красиво. Но я такой красоты никому не пожелала бы. Плюс травмы, о которых я вообще боюсь не то что говорить, а даже думать. И это не такие травмы, что ты шел и сломал ногу. У спортсменок травмы проявляются именно там, где организм слаб. Сердце, позвоночник, суставы... Правда, у нас сейчас новый хороший врач появился — Павел Дриневский. Целых 2 миллиона рублей в месяц получает. Хотя человек любит свое дело, болеет за него душой. Мне, например, абсолютно непонятно, почему у нас хоккеисты в некоторых командах зарабатывают по 500 миллионов в месяц. А 70 миллионов — это вообще зарплата второстепенного хоккеиста. У нас четыре года надо горбатиться, чтобы такой заработок иметь после завоевания медали на Олимпиаде. Девочки, можно сказать, целыми днями живут в зале. Они приходят в 8 утра и в 10 вечера уезжают. Спят здесь, едят, у нас нет другой жизни.

— А как вы отдыхаете, расслабляетесь?

— Во время тренировок у меня есть час на отдых, но иногда и этого нет. Когда мама жила в Севастополе, ездили туда на море. Но маму пришлось перевезти в Минск, так что поехать куда-то на отдых стало проблематично. Да и не любит муж пляж и море. Хотя не так давно съездил к друзьям в Америку, а оттуда — в Доминикану. Но сказал: "Больше не хочу в такую жару". Сидеть в номере в компьютере ему было интересно. Сейчас у нас появилась дача, правда, там я была пока всего один раз.

— Вас часто предавали в жизни близкие люди?

— Было, но не часто. После предательства эти люди, кстати, просили прощения, каялись... Я, конечно же, прощала. Случались и разные наговоры, но на такие вещи я вообще внимания не обращаю. Если все это принимать близко к сердцу, то надо было бы уже давно повеситься.

— Любящий муж, слава, известные ученицы, признание… Все это вы имеете. А чего сегодня Ирине Лепарской не хватает в жизни для полного счастья?

— Чего не хватает?.. Нового гимнастического зала, лучших условий для тренировок. Хочу, чтобы было здоровье у всех моих близких и знакомых. Будет здоровье — все остальное появится. Что еще надо?..

Алесь СИВЫЙ.
Фото kp.by и interfax.by

ЭКСПЕРЫМЕНТ

У Мінску будуць вырошчваць трансгенную бульбу

Праз некалькі гадоў яна можа з'явіцца ў магазінах.

Гэтай вясной на спецыяльным палігоне будзе ўпершыню высаджана трансгенная бульба з падвышанай устойлівасцю да каларадскага жука і захворванняў. Пра гэта паведаміў кіраўнік Нацыянальнага каардынацыйнага цэнтра біябяспекі Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук **Сяргей Драмашка.**

Палігон плошчай 0,3 га знаходзіцца на вуліцы Скарыны на біялагічным эксперыментальным полі. Ужо закуплены спецыяльная сельгастэхніка і лабараторнае абсталяванне, якія будуць выкарыстаны толькі пры выпрабаванні гэтых раслін. Палігон абгароджаны двухметровай бетоннай сцяной, поле абсталявана відэакамерамі і сігналізацыяй.

Паводле слоў вучонага, прадугледжаны таксама маніторынг навакольнага асяроддзя вакол палігона. Назіранне будзе весціся за насякомымі і раслінамі ў радыусе 300 метраў вакол палігона.

На працягу некалькіх гадоў навукоўцы будуць назіраць за навакольным асяроддзем і даследаваць выгадаваныя трансгенныя расліны.

"Пры ўмове, што ніякіх шкодных наступстваў для чалавека і навакольнага асяроддзя не будзе, можна будзе чакаць гэтую прадукцыю на нашых прылаўках", — цытуе БелаПАН спецыяліста. У выпадку паспяховага завяршэння выпрабаванняў трансгенная бульба будзе прыроўнена да іншых гатункаў бульбы, і ніякіх спецыяльных умоў для яе вырошчвання не спатрэбіцца.



Ці будзе запатрабаванай трансгенная бульба?

Паводле слоў вучонага, з аднаго боку, такія расліны працей вырошчваць, чым іншыя гатункі, але з іншага — ёсць верагоднасць, што насельніцтва Беларусі не прыме навінку. Так, у Нямеччыне і Швецыі ў 2012 годзе адмовіліся ад вырошчвання трансгеннай бульбы з-за яго непрымання шырокай грамадскасцю.

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО…

У Беларусі ў лабараторных умовах ужо створаны трансгенны гатунак льну-даўгунцу, які, як лічаць спецыялісты, дазваляе атрымаць высакаякаснае валакно.

А Цэнтральны батанічны сад ўжо некалькі гадоў вырошчвае генна мадыфікаваныя журавіны і дурніцы.

**Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл. (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906
nv@promedia.by
http://www.nv-online.info http://twitter.com/narodnaya_volya**

ISSN 2071-9647

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 18.03.2013 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 27400 экз. Заказ №1030.